УДК 81.373.21

# АНАЛІЗ МІКРАТАПОНІМАЎ БАРАНАВІЦКАГА РАЁНА МЯСТЭЧАК АМНЕВІЧЫ І ГАРАНАВІЧЫ З ДАПАМОГАЙ ГІС-ТЭХНАЛОГІЙ

**П. С. Гуцько**

кафедра глебазнаўства і ГІС факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі
Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, г. Мінск, gytko.filip@gmail.com

**А. Я. Яротаў**

кандидат географических наук, дацент факультэта геаграфіі и геаінфарматыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск

У рабоце былі вызначаны мікратапонімы мястэчак Амневічы і Гаранавічы Баранавіцкага раёна, выкарыстоўваючы атрыманую інфармацыю, тапонімы падзялілі на групы лексіка-семантычнай класіфікацыі. На выснове якой быў дадзены аналіз прычын падабенства і адрозненняў тэрміналагічнай сістэмы тапонімаў у межах абранай тэрыторыі па структурнаму і колькаснаму паказчыку розных груп тэрмінаў.

**Ключавыя словы**: тапаніміка; лексіка-сімантычная класіфікацыя; зямельна інфарматыйная сістэма.

У Рэспубліцы Беларусь 2022 год абвешчаны годам гістарычнай памяці. Зыходзячы з гэтага, для вывучэння гісторыі сваёй краіны, яе асобных мястэчак была праведзена работа па даследаванні і аналізу мікратапонімаў на прыкладзе мястэчак Амневічы і Гаранавічы Баранавіцкага раёна з дапамогай ГІС-тэхналогій.

Мэтай работы з’яўляецца аналіз мікратапаніміі Баранавіцкага раёна мястэчак Амневічы і Гаранавічы з мэтай выяўлення ролі фактараў прыродных, сацыяльна-эканамічных і этнакультурных на фарміраванне мікратапанікону тэрыторыі. Мікратапонімы- гэта сукупнасць мясцовых геаграфічных назваў невялікіх аб'ектаў (вуліцы, урочышчы і т.д.). А Тапаніміка – гэта навука аб геаграфічных назвах: іх паходжанні, сэнсавым значэнні, змяненні (трансфармацыі), напісанні, вымаўленні і перадачы з адной мовы на іншы. Геаграфічныя назвы-гэта асаблівыя словы, названыя тапонімамі [1].

Для аналіза мікратапаніміі былі вызначаны назвы і геаграфічнае размяшчэнне тапонімаў, з дапамогай апытання мясцовых жыхароў. У апытанні ўдзельнічала 5 жыхароў мястэчак Амневічы і Гаранавічы, якія расказалі назвы тапонімаў і ўказалі іх размяшчэнне. У выніку апроса было выяўлена 97 тапонімаў на тэрыторыі плошчай ў 14,5 км$^2$ і створана картасхема размяшчэння тапонімаў мястэчак Амневічы і Гаранавічы (рысунак 1).

Таксама была створана картасхема размяшчэння тапонімаў мястэчак Амневічы і Гаранавічы на вынове ЗІС, каб параўнаць вызначэныя тапонімы з землямі ў ЗІС (рысунак 2) [2].




*Рыс. 1.* Тапонімы мястэчак Амневічы і Гаранавічы




*Рыс. 2.* Тапонімы мястэчак Амневічы і Гаранавічы

Выкарыстоўваючы атрыманую інфармацыю, тапонімы падзялілі на групы лексіка-семантычнай класіфікацыі. Лексіка-семантычная (семантычная) класіфікацыя выглядае наступным чынам: назвы, якія адлюстроўваюць прыродныя ўмовы і працэсы (аранамічныя, гідранамічныя, зоатапонімы, фітатапонімы, літалагічныя); антратапонимы; харонімы; транспартныя; адрасныя; рэлігійна-культавыя тапонімы; запазычаныя; іншыя тапонімы (не паддаюцца тлумачэнню або суаднясенню да якой-небудзь групе) [3].

У цяперашні час семантычная класіфікацыя найбольш часта выкарыстоўваецца спецыялістамі як найбольш прымальная пры агульным тапанімічнай аналізе.

З дапамогай ГІС-тэхналогій была створана картасхема лексіка-семантычнай класіфікацыі групы тапонімаў мястэчак Амневічы і Гаранавічы (рысунак 3).




*Рыс. 3.* Лексіка-сімантычная класіфікацыя тапонімаў мястэчак Амневічы і Гаранавічы

На выснове лексіка-сімантычная класіфікацыя быў дадзены аналіз прычын падабенства і адрозненняў тэрміналагічнай сістэмы тапонімаў у межах абранай тэрыторыі па структурнаму і колькаснаму паказчыку розных груп тэрмінаў (рысунак 4).




*Рыс. 4.* Лексіка-сімантычная класіфікацыя тапонімаў

Большая частка тапонімаў адносіцца да Антратапонімаў – 26, што сведчыць аб тым, што на абраную тэрыторыю мела значны ўплыў дзейнасць чалавека, размяшчэнне яго паселішчаў і належнасць зямлі пэўным людзям. Прыкладамі такіх тапонімаў з'яўляюцца тапонімы ад імёнаў і прозвішчаў людзей: мундарава, нічыпара, селіцкага, мікульшчына, сінкаўшчына, паўлючэнкава і інш.

Значная частку займаюць фітатапонімы – 17, што звязана з вялікай кольkасцю лясоў і балот, каля мястэчак, з саставам дрэвастою і расліннасці. Прыклад тапонімаў: хвойнік, куняціна, грабунік, ельнік, гай, дубняк і інш.

Адрасных тапонімаў выдзеляна 15, гэта тапонімы якія ўказваюць накірунак ці месцазнаходжанне пэўнай тэрыторыі адносна іншай тэрыторыі ці аб'екта (пад дубам, за буртом, пад маяк, загумна, навазы і інш.).

Значнаю частку займаюць сельскагаспадарчыя – 8, яны маюць як і сучаснае паходжанне (соткі, ферма), так і старажытнае(клін). Пры дэтальным аналізе сельскагаспадарчых тапонімаў можна вызначыць следы падсечна-агневога земляробства, якім людзі крысталіся IX – XIII стагоддзях, на гэта указваюць наступныя тапонімы лясоў: нівішча, ратаўка, завалы, пагарэлае.

Да аранамічных адносіцца 7 тапонімаў (балканы, горкі,кругляк,курганы і інш.), гідранамічныя – 6 (азярышча, крыніца, азерскі луг), зоатапонімы – 5 (лісьі норы, саковішча, малая ялуня).

Найменьшую частку займаюць літатапонімы (глінішча), рэлігійна-культавыя (могілкі), харонімы (сярэдніца), этнатапонімы (ляхавічы, хахлы), запазычаныя (патарошы), транспартныя (гасцінец).

Тапаніміка – важная крыніца для даследавання гісторыі пэўнай тэрыторыі, мову народа ці народаў, якія жылі на гэтай тэрыторыі, дапамагае аднавіць рысы гістарычнага мінулага, вызначыць межы дзейнасці і рассялення чалавека, акрэсліць вобласці распаўсюджвання пэўных назваў, геаграфію размяшчэння насельніцтва, яго дзейнасць. З дапамогай мікратапаніміі можна выявіць фізіка-геаграфічныя ўласцівасці мясцовасці. Сацыяльную і эканамічную дзейнасць людзей, якія тут пражывалі некалі і пражываюць зараз.

### БІБЛЕАГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Топонимика: уч-метод. пособие / А.Е. Яротав, А.А. Сазонов, Е.А. Козлов. – Минск: БГУ, 2019. – 168 с.
2. Геопортал ЗИС. УП «Проектный институт Белгипрозем [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://gismap.by/next/ – Дата доступа: 10.09.2022.
3. Яротов А.Е. Курс лекций по топонимике Беларуси [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/38182 – Дата доступа: 12.09.2022.